**УДК 39**

# ВОБРАЗ «ПАДАРОЖНАГА БОГА» Ў ЛЕГЕНДАХ АБ УСТАЛЯВАННІ ЭТЫЧНЫХ КАШТОЎНАСЦЕЙ БЕЛАРУСАЎ ПАДЗВІННЯ

***Д. В. ЖУКАЎ***
***(Прадстаўлена: канд. гіст. навук, дац. У. Я. АЎСЕЙЧЫК)***

*У артыкуле прасочваецца роля падарожнага Бога ў легендах аб ўсталяванні сацыяльна-этычных нормаў чалавецтва. На тэрыротрыі Падзвіння зафіксаваны сюжэты, паводле якіх Бог ходзе па зямлі і навучае людзей, засцерагае іх ад бяды, але можа і караць іх за парушэнне імі маральна-этычных нормаў. Маральныя прынцыпы, адлюстраваныя ў легендах пра падарожнага Бога, з'яўляюцца важнымі і актуальнымі для сучаснага беларускага грамадства.*

***Ключавыя словы:*** *«Падарожны» Бог, легенды, людзі, пакаранне, хатняя жывёла.*

У беларускай фальклорнай традыцыі пашыраны сюжэыты, згодна з якімі першапачаткова Бог стварыў людзей волатамі ці асілкамі, але потым пакараў іх за тое, што яны вырашалі памерацца з ім сілай: *«Гэта цяпер людзі здрабнелі да сталі нядужыя, а даўней былі такія вялізарныя, бы дуб, да дужыя, што хацелі з Богам дужацца. Дак за тое Бог іх пакараў да й абярнуў у малых да кволых людзей, якія й цяпер жывуць»* [2, с. 94].

У традыцыйных уяўленнях беларусаў Бог звычайна прадстаўлены ў выглядзе сівога барадатага старога, які жыве на небе і часам вандруе па зямлі: «*А вот гэта, дык скажу табе, мая мама мне расказывала. Яны жылі, ну беднавата жылі, не было ў іх, мала зямлі было ў іх і яны хадзілі ў наёмы. Там дзярэўня Броўцы называлася, і яны там пахалі зямлю. Едзем, ужо на поле, на сваё чэраз дзярэўню. Ну, сабакі, кажыць, ніхто не забрахалі. Едзем, глядзім – ідзець сівенькі дзядок. Сівенькі дзядок ішоў, надзеты па-простаму, сваё было надзета. Усе саматканае надзета, сваё. Яны дажы відзілі гэтага дзядка, як ён ішоў гэты дзядок на ўстрэчу ім, ішоў такі і прайшоў каля іх. Вот яны апрадзялілі, што Бог ідзець. Тады кажыць, можа ўжо Бог ідзець. Апрадзялілі, што гэта Бог ідзець. Прайшоў, а тады, як яго не стала, тады сталі і сабакі брахаць, людзі сталі паяўляцца. Вот так і апрадзялілі, што гэта Бог ішоў*» (Ушацкі р-н) [3, с. 66-67].

Як лічыцца, раней людзі жылі разам з Богам і мелі большы дастатак, чым цяпер. Сустракаюцца сюжэты, у якіх тлумачацца прычыны пакарання чалавечага роду. Так, адной з прычын, якая выклікала пакаранне, стала непаважлівае стаўленне людзей да хлеба: «*Бог пасеяў шмат каласоў. А адна гаспадыня з гэтага жыта спякла блін і абцерла ім сваё дзіця. За гэта Бог апусьціў людзей на зямлю і даў ім толькі адзін каласок, бо хлеб – гэта сьвятое*» (Бешанковіцкі р-н) [4, с. 47]. Але існуюць сюжэты, паводле якіхжанчыны самі папрасілі Бога скараціць каласкі, бо было цяжка жаць: *«Адна баба жыта жала. А гэты колас быў ад карня да верху. Вяжыцца гэта саломка, вяжыцца, а тады не вязалась. Тады жанчына ўзяла гэты колас, а ён крышацца. Тады яна: «Штоб ты праваліўся!» А тут Бог недалёка. «Ну раз так! – узяў ён гэты колас ад карня, як шмарганyў доверху»* [3, с. 60].

Але ў некаторых сюжэтах такога роду гаворыцца, што гэта пакаранне людзям за тое, што яны сталі рабіць с жыта гарэлку: «*Як бог першы раз сваёю рукою засеяў жыта, то такое было хароша! Зярнята, як боб, каласы – тотак, як сейрукі ў гаросе, ад самаго нашня ўверх раслі, а расло на салому высокае, аж у трубу вілося... Але як чорт прыдумау з жыта гарэлку гнаць, то цяпер дзесятай долі такое не родзіць*» [2, с. 75]. На тэму сатварэння гарэлкі як вынаходніцтва чортавага прадукта для яго злосных жартаў над п'янымі людзьмі, невыпадкова, існуе значны комлекс легенд, паводле каторых Бог, каб чалавек не ўжываў чортаў прадукт (тым самым не трапляў у сферу ўплыву нячыстай сілы), атрымліваў Божую дапамогу: «*Гарэлку выдумаў чорт. Гоніць чорт гарэлку, а Бог ідзець. А ён гаворыць: «Што ты дзелаеш?» – «Ганю гой, а хто яе вып'ець, той будзець мой». А Бог гаворыць: «Ты гоніш гарэлку, а я дам мерку». Даў чарачку. Чарачку вып'ець [чалавек], тады і нічога*» [3, с. 38]. Менавіта таму карчма, як лічаць беларусы, адзначана злом. Акрамя таго, лічылася, што ў той момант, калі паміж храмам Божым і карчмой чалавек выбірае другое, ён становіцца лёгкай здабычай для нячыстай сілы. Такі чалавек лічыцца парушальнікам традыцыйных нормаў культуры і этыкі.

Ідэя паважлівага стаўлення да хлеба праводзіцца і ў легендах пра «сабачую і каціную долю», дзякуючы якой людзі маюць свой хлеб: «Ішоў Бог, зайшоўся к бабцы, а баба пякла бліны, а малы абробіўся. А яна ўсё раўно пякла бліны, і яму жопу падцёрла. А ён сказаў: «*Вот цяперака хлеба ў вас ня будзець». І тады гэты хлеб ён ужэ ўбіраў з коласа, а сабакі і каты як сталі драць, і затое малыя каласкі*

*асталіся»* (Ушачці р-н) [3, с. 61]. Думка годнага дачыненні да братоў нашых меншых з'яўляецца асноўнай ва ўсіх сюжэтах гэтай легенды. У некаторых з іх акцэнт робіцца менавіта на стаўленні да жывёл, а ўжо потым да хлеба: «*Жыта такоя расло. Каласы ад зямлі. А людзі былі такія ў Бога няверуюшчыя. Што гэта хлеб мы ядзім чый. Катоў білі, сабак. Усіх. Як стаў Бог хлеб уністожаваць, каб людзі ўжо гэдак не рабілі, дык сабакі і каты сталі гвалт крычаць, прасіць у Бога. Дык Бог аставіў ім колас. Бог стаў хлеб уністожаваць затоя, што людзі сталі скаціну не жалець. Што хлеба многа з'ядаюць. Дык каты і сабакі сталі прасіць. Мы жывём на кацінай і на сабачай долі*» (Глыбоцкі р-н) [3, с. 61].

Шырокі комлекс легенд, які таксама звязаны з хатняй жывёлай, паведамляе аб тым, чаму чалавечы дзіцёнак да года не ходзе, як, напрыклад, цялёнак: «*Пашлі бабы к Богу: почэму такая несправядлівасць? Што, вот, каровы, коні, жывотныя рабёнка там сваего, жарабёнка ілі цялёнка (родзяць) і тут жа цераз паў дня ён пашоў на ногі і ходзіць. А мы родзім і гэтага рабёнка нада гадаваць два-тры гады, пакуль ён пойдзець. Бог падумаў, падумаў і гаварыць: «Хм, ладна, магу здзелаць, толькі условіе: што вам мужык нужан будзець толькі раз у год». Вот одна эта жэншчына вышла ат Бога і прышла да другіх жэншчын і гаворыць, што Бог дал вот такое условіе. Падумалі, жэншчыны, падумалі: не, пусць будзець па стараму*» (Міёрскі р-н) [3, с. 66]. Але існуе больш пашыраная гісторыя, у якой сюжэт развіваецца ў больш архаічны час: «З істары, бывала, ніхто не хадзіў, як родзіцца: ці сабака, ці кот, ці карова – ніхто. Носіць хазяйка цэлы год ды гадуець, як дзіцёнка. І патуль гэдак было, паку ль ужо стаў бог хадзіць з вучанікамі па зямлі. Тады прышоў раз бог к хазяйцы. А яна на руках качаець цялёнка, ведама, ён не ходзіць. Жалка стала богу; ён і кажаць: – Дайты мне, што ў цябе родзіцца, я перакіну чараз зярод, і яно будзець хадзіць, як толькі родзіцца: хто б сабе не быў – ці шчанёнак, ці парасёнак. Баба тая падала тады богу парасёнка. Ён узяў і перакінуў яго чараз зярод. Парасёнак той і пабег. Тады яна дала яму жарабёнка. Ён перакінуў яго чараз зярод –і жарабёнак пабег. Дала яму цялёнка – і цялёнак пабег. І каго толькі ні давала – і шчанёнка, і кацянёнка, і ўсіх,–ён як толькі перакінець чараз зярод, так яно й пабяжыць. Перадавала яна гэдак усіх, хто толькі ёсць у хазяйстве. І быў у яе дзіцёнак малы ў хаце. Бог кажаць: – Давай дзіцёнка. Я перакіну чараз зярод, ён тады, як родзщца, будзець хадзіць. А яна кажаць: – А не, баюся. Ён заб'ецца. І не дала. Дык вот затым дзеці цяпер і не ходзяць, як родзяцца» [2, с. 52].

Згодна з традыцыйнымі ўяўленнямі, аднойчы, калі Бог папрасіўся ў дом, яго пераблыталі з жабраком і не пусцілі. З-за гэтага цяпер неабходна пускаць да сабе тых людзей, якія маюць патрэбу, бо гэта можа быць не проста бяздомны: «*Эта не пры нашай памяці. Спасіцель хадзіў з апосталамі. Вот ён прыдзіць старычком у хату. Сматра як хто яго прыміць. Адна ўдава так ужо ў хаці чысціла, а спасіцель ішоў, а яна яго не пусціла ў хату. А ён ішоў жабраком. А яна: «Вот і цябе чорт нясець, да мяне сёння добры госць прыдзіць». І ні пусціла яго, не дала нічога. А гэта быў Спасіцель. Затоя цяпер міласціню даюць жабракам*» (Глыбоцкі р-н) [3, с. 47]. Але існуюць сюжэты, паводле каторым, менавіта сам Бог загадаў, каб людзі дапамагалі жабракам і тым, якія жывуць у нястачы: «Я нічога ад вас не хачу, адно дайце слова, што кажон тыдзень прымеце жабрушчага чалавека, якога пакорміце і пазволіце пераначаваць» [2, с. 43].

Згодна з легендамі, на такіх умовах Бог навучыў людзей прасякаць вокны ў доме. Цяпер лічыца, што калі людзі вераць ў Бога, то нельга абдзяліць нішчага ці няшчаснага – яму трэба дапамоч: «*Прыходзілі жабракі, да. Ім нада тожа даваць […]. Гэта відзіш, нада жабраку тожэ даць тое што ты сам ясі, што табе. Эта Бог жабракоў прысылаець*» (Віцебскі р-н) [4, с. 271].

Адна з самых распаўсюджаных легенд на Падзвінні, якая звязана з «Падарожным Богам» мае сюжэт, які распавядае аб тым, чаму людзі перасталі ведаць, калі памруць: «Шоў Бог. А мужык гародзіць саломай плот. І Бог спрашвае: «*Што вы так вот, саломай гародзіце?» А ён гаворыць: «Я заўтра памру, так для чаго мне гарадзіць яго?» Вот Бог і здзелаў, штоб вотіменна, каб не зналі людзі, памруць када. А то зналі людзі, кагда чалавекпамрэць*» (Полацкі р-н) [3, с. 51]. Легенда пра мужыка і саламяны плот з'яўляецца адной з самых знакамітых на тэрыторыі Падзвіння: «*Па дарозе Бог хадзіў, ну і адзін старычок (раньшы ж зналі, калі памруць) нагнаў кольлека, саломкі – плот гародзіць. Ідзець Бог і кажа: «Дзед, а што ты плот з саломы гародзіш, ён жа някрэпкі будзе?» – «На мой век хопіць, я тады і тады памру». Тады Бог здзелаў так, што мы не знаем, калі мы памром. Во гэдак мне мама расказвала*» (Лепельскі р-н) [3, с. 51]. У архіве Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта захоўваюцца варыянты легенд «пра саламяны плот» з Полацкага, Глыбоцкага, Гарадоцкага, Ушацкага, Шумілінскага, Пастаўскага і Докшыцкага раёнаў. Таксама існуюць існуюць іныя прычыны, з-за каторых Бог лішыў людзей іх «дара» бачыць час сваёй смерці: «*У нас кажуць, што ідзе Бог, а баба і дзед удваіх старэнечкія сядзяць і такая хатка абыякая, тутака ўгалочак толькі закрыты, штоб дождж не намачыў. А Бог кажа: «А чаго гэта так сядзіце, што тут дождж ідзе, а вы толькі так?» – «А нам скора ўміраць, нам нічога не нада астаўляць». – «А, дак вот я так і сдзелаю, што знаць ня будзеце, калі ўміраць». Цяпер і не знаем, калі ўміраць. Збіраем дабро, збіраем і астаўляем нашым дзецям*» (Ушацкі р-н) [3, с. 51]. Такое рашэнне было прынята Богам з-за таго, каб людзі не пераставалі працаваць і пакідалі што-небудзь нашчадкам.

Другая вялізарная частка легенд пра «Богаву долю» паведамляе аб розніцы ў дачыненні да маючых патрэбу паміж бедным і багатым чалавекам: «Ішоў старычок, а гэта быў Бог. І просіцца пераначаваць. Прыходзіць ён у хату, а на стале паўно снедзі, а яму нічога не далі. А хазяйка бліном жопу дзіцёнку падцірае. Не пусцілі яго начаваць. Пайшоў ён далей. Прыходзіць ён у другую хату, а там дзяцей поўна, жывуць бедна. А хазяйка кажа: «*Праходзь бліжэй, убогі чалавечык». Корміць яна дзяцей, а яны падбягаюць к старычку і кажуць: «Угашчайся, убогі чалавечык, і ты». І пайшоў старычок далей і зрабіў так, што ўраджай ад багатага перайшоў к беднаму. Дык багаты ў суд падаў на беднага і сказаў, што той у яго ўраджай украў, а бедны кажыць: «Як я магу ўкрасці зярно разам з зямлёю?*» (Ушацкі р-н) [3, с. 67].

Маральныя прынцыпы, адлюстраваныя ў легендах пра падарожнага Бога, з'яўляюцца важнымі і актуальнымі для сучаснага беларускага грамадства. Так, існуець комплекс легенд, сюжэт якіх мае даволі просты матыў «рабі дабро і табе аддасца»: «*Расказывалі, што даўней Бог па зямлі хадзіў. Была рака, над якой стаяла хатка. Жыла там старуха і прыйшоў Бог туды.А яна ня знала што гэта Бог. Ну а ён просіцца начаваць і яна яго пусьціла. На заўтра яна яму есьці строіць, а ён кажыць: «Я не хачу есьці.» І ён кажыць: «Пачынай якую работу рабіць, каб яна была табе палезная». Яна пачала палатно рэзаць. Рэжа, рэжа... І столькі ў яе стала палатна, што яна яго прадавала і прадавала. І ёй рабіць болі ня нада было. А старычок той і пайшоў*» [3, с. 52-53]. У апавяданні Яна Баршчэўскага «Дзіўны кій» размова таксама ідзе пра «падарожнага» Бога. Паводле сюжэта, калі галоўнаму герою на дарозе сутракаюцца тры старца (жабрака), ён, аддаўшы ім усе свае грошы, атрымлівае за гэта дзіўны падарунак: «Не турбуйся за заўтрашні дзень, – сказаў жабрак. – Аддаю табе гэты кій... і ты, калі будзеш мець якую-небудзь патрэбу, падымі да неба той канец кія, якім абапіраешся на зямлю, і адразу зробіцца ўсё, што ты захочаш» [1, с. 273].

Шэраг легенд пра падарожнага Бога прысвечаны фальклорнаму (у пэўнай ступені гумарыстычнаму) тлумачэнню бія-сацыяльных адрозненняў паміж людзьмі, у прыватнасці – чым адрозніваецца праца мужчын і жанчын: «*Бог ішоў і пытаўся дарогі. Мужчына паказаў яму дарогу. Дык мужчыне ўсігда хватаець врэмя на ўсё. Ішоў конь. Пытаўся і ў каня. Дык конь тожа сказаў, што яму некалі, яго толькі атпраглі, ён есьці хочаць. І не паказаў дарогі. Карова хадзіла на полі. Бог папытаўся ў каровы. Дык яна кінула есьці ды вывела Бога на дарогу. Дык ей і цяпер часу хватаець. Яна ляжыць і ляжыць і жваку жвець. А каню некалі, ніколі німа часу. І мужчыну хватаець часу. А баба жала. А Бог пытаець дарогу. Дык яна жала, сказала, мне няма калі, і нагой паказала. За гэта бабам няма калі жыць свабодна. Гэта ж даўней было*» (Глыбоцкі р-н) [3, с. 64]. Гэта апавяданне таксама распавядае аб тым, чаму мужчына робіць працу стоячы: «*Вот і мама расказвала, што Бог ішоў па зямлі і сустрэўся з мужчынам, мужчына касіў. Ну гаворыць: «Давай пасядзім, дзед». Ну мужчына гэтым касу кінуў, сеў, і пасядзеў. Вот пасядзеў з гэтым Богам. Значыць, 64 мужчына робіць усю толькі стаечую работу. А ішоў, а жэнчына жала. «Хадзі, – кажыць, – пасядзі са Мной». – «Ай, не мне некалі сядзець». – «Ну, а дарогу хоць пакажы». А яна нагой яму дарогу паказала, куды ісці. Затое жэнчына і робіць усе врэмя цяпер сагнутая*» (Лепельскі р-н) [3, с. 63-64].

Такім чынам, можна вызначыць наступнае: ва ўсім комплексе беларускага народнага эпасу маецца значны аб'ём сюжэтаў, звязаных з вобразам падарожнага Бога. Паводле іх Бог ходзіць па зямлі і навучае людзей, засцерагае іх ад бедаў, але можыць і караць іх за парушэнне маральна-этычных нормаў. Прасочваецца ідэя паважлівага стаўлення да хлеба, жывёл, старцаў. Пошук сэнсу свайго існавання, апраўданне цяжкага і знясільваючай працы і несправядлівага сацыяльнага падзелу таксама маюць права называцца прычынамі з'яўлення сюжэтаў такога роду. Маральныя прынцыпы, адлюстраваныя ў легендах пра падарожнага Бога, з'яўляюцца важнымі і актуальнымі для сучаснага беларускага грамадства.

## ЛІТАРАТУРА

1. Баршчэўскі, Ян. Выбраныя творы / Ян Баршчэўскі; уклад., прадм. і камент. М. Хаўстовіча. – Мінск: Беларускі кнігазбор, 1998. – 480 с.
2. Легенды і паданні / [Склад. М. Я. Грынблат і А. І. Гурскі; Рэд. тома А. С. Фядосік]. — Мн.: Навука і тэхніка, 1983. — 544 с.
3. Полацкі этнаграфічны зборнік / уклад., прадм. і паказ. У. А. Лобача.– Вып. 2: Народная проза беларусаў Падзвіння. У 2 ч. Ч. 1. – Наваполацк: ПДУ, 2011. – 292 с.
4. Полацкі этнаграфічны зборнік / уклад., прадм. і паказ. У. А. Лобача. – Вып. 2: Народная проза беларусаў Падзвіння: у 2 ч. – Ч. 2. – Наваполацк : ПДУ, 2011. – 368 с.